# АБЫШОЎ 45 РАЁНАЎ

і патрэбна праверанае, раяніраванае, высакаўраджайнае. Раней мяне стараліся пераканаць, што ніколі нельга разлічваць у Камянецкім раёне на ўраджайнасць большую за 40 цэнтнераў. А мы стабільна атрымліваем больш за 60.

Цудоўна расце кукуруза — па 140 цэнтнераў, бо было насенне высокапрадукцыйных сартоў. Яно хоць і дарагое, але сябе апраўдала.

***— Але Мароз не быў бы Марозам, калі б не думаў пра перспектыву...***

— Запланавалі будаўніцтва каўбаснага цэха на 50 тон за суткі. Пачалі рабіць дакументацыю.

Але спачатку мусім зрабіць тую важную справу, пра якую ўпамінаў, — уцяпліць будынак свінагадоўчага комплексу пенапластавымі плітамі, а ўнутры ўзвесці яшчэ адну, тонкую сценку. Будынку сёлета споўніцца 35 гадоў, і такія меры не лішнія. Плюс новыя падлогі, новыя перагародкі, уцяпленне даху, глыбокая замена грунту і каналаў для выдалення гною. Што ў выніку дазволіць да мінімуму звесці спажыванне газу для ацяплення і забяспечыць санітарны парадак у карпусах, абараніць статак ад хвароб.

На комплексе створаны цудоўны калектыў спецыялістаў, рабочых, у новых умовах ім таксама працаваць будзе лягчэй.

Што датычыцца новага цэха для вытворчасці каўбасных вырабаў і паўфабрыкатаў, то сёння мы ў даволі абмежаваных умовах можам за суткі выпускаць 18 тон прадукцыі. Новыя магутнасці выведуць нас на новыя гарызонты.

А на вызваленых плошчах атрымаем магчымасць з паўнавартасных адходаў мясной вытворчасці наладзіць выпуск высакаякаснага харчавання для кошак і сабак. Пакуль такая прадукцыя за рэдкім выключэннем паступае з-за мяжы.

А ў перспектыве — будаўніцтва яшчэ адной сучаснай малочнатаварнай фермы на тысячу галоў, паколькі малако вельмі рэнтабельнае (за студзень гэтага года рэнтабельнасць склала больш за 60 працэнтаў).

З задач, якія зараз таксама трэба вырашаць у першую чаргу, — павышэнне сярэднясутачных прыбаўленняў у вазе на свінагадоўчым комплексе. Калі за мінулы год на адкорме было 710 грамаў, то сёлета павінны дабіцца не менш як 780 грамаў.

І ўжо цяпер клапацімся пра кармы, бо будуць кармы — будзе і прадукцыя. І павялічваць надоі малака.

Працаваць над якасцю прадукцыі. Якасць трэба трымаць, гэта аснова. Студзень адпрацавалі — ніводнага літра вышэйшай якасці не прадалі, усё малако ішло класам «экстра». І на момант нашай з вамі размовы, а гэта сярэдзіна лютага, — таксама.

Вось пра ўсё гэта мы будзем гаварыць заўтра на сходзе. Асабіста мне ўпэўненасці надае тое, што ў «Белавежскім» — вельмі моцны калектыў, тут працуюць высокапрафесійныя спецыялісты, высокапрафесійныя намеснікі. 99 працэнтаў членаў калектыву — цудоўныя людзі, трымаюцца за работу абедзвюма рукамі.

***Мы зараз пачалі шмат гаварыць пра нацыянальную ідэю. Самая галоўная нацыянальная ідэя — адзінства.***

## 4. «І АМАЛЬ КОЖНЫ — ПАТЭНЦЫЙНЫ АРДЭНАНОСЕЦ»

***— Ваша шматпрофільнасць — так цікавей працаваць для саміх? І — больш бяспечна?***

— Больш бяспечна для гаспадаркі. Важна, што ў нас вытворчасць адладжана як часавы механізм. Сёння нам трэба атрымліваць 600 парасят за дзень — мы іх атрымаем. Камбікормавы завод павінен даць 200 тон камбікорму — значыць, яны будуць, чаго б ні каштавала. Кожны дзень патрэбна забіць не менш за 700 галоў свіней і на наступны дзень прадаць іх... Збояў у вытворчым ланцужку не павінна быць.

***— У вас ёсць вопыт работы з адстаючымі гаспадаркамі, вы далучылі да сябе ў розныя часы аж чатыры калгасы, у тым ліку і славутую некалі «Савецкую Беларусь». Вось скажыце, што сёння рабіць з тымі больш чым 300 «ляжачымі» айчыннымі гаспадаркамі?***

— Аб'ядноўваць з суб'ектамі гаспадарання, якім патрэбна сельскагаспадарчая прадукцыя ў якасці сыравіны, хто мае грошы, каб падняць «ляжачага». І такія лідары ёсць, у тым ліку ў прыватным сектары эканомікі. Разумны прыватнік пойдзе на такое аб'яднанне, бо яму патрэбна ўласная крыніца сыравіны. І не менш — паразуменне ў грамадстве, у кіраўніцкіх структурах. Такіх прыкладаў і ў нашай зоне дастаткова. А не аб'ядноўваць проста для галачкі. Паспешлівасць вылезе наверх вельмі хутка, калі «лягуць» абодва.



Новы комплекс для сушкі збожжа ў аддзяленні «Расна».

Выцягваць адстаючых вельмі важна тым больш, што сёння сямімільнымі крокамі, з удзелам прыватнага капіталу (звярніце ўвагу) развіваецца вытворчасць свініны і мяса птушкі ў Расіі, і вельмі хутка можна апасацца канкурэнцыі з боку расіян нават на нашым рынку. Ужо сёння ў суседняй Бранскай вобласці на 15 комплексах на адкорме стаіць больш за мільён галоў свіней. У Белгародскай больш за два. Тое, што на ўсю Беларусь.

Там вельмі моцная падтрымка вытворцаў і з боку дзяржавы. Міністр сельскай гаспадаркі Расіі Аляксандр Ткачоў, былы губернатар Краснадарскага края, паставіў задачу за пяць гадоў, максімум за сем, закрыць уласныя патрэбы федэрацыі і ў малочнай прадукцыі. У якасці прыкладу прывёў Беларусь, беларускую схему.



**З шырокім асартыментам экалагічна чыстай, высакаякаснай прадукцыі знаёміць начальнік мясакамбіната Лідзія РЫЖОВА.**

Прыемна, вядома, але і трывожна. Улічваючы, што цяпер у іх крэдыты для вёскі — пад любыя праекты і пад 5 працэнтаў. І існуе адчувальная бюджэтная падтрымка нарошчвання малочнага статка і тэхнічнага пераўзбраення. Можна чакаць, што беларуская прадукцыя будзе з цягам часу выцясняцца з расійскага рынку.

Гэта — калі мы застанёмся стаяць на месцы ў вызначальных суадносінах «цана — якасць».

***— Якую праблему для айчыннага аграпрамысловага комплексу вы маглі б вылучыць у якасці асноўнай?***

— Кадравую. Падабраць нармальнага кіраўніка гаспадаркі часта складана. Лідараў сельскагаспадарчай вытворчасці трэба па-сапраўднаму рыхтаваць і па-сапраўднаму зацікаваць. Калі ёсць дэфіцыт падрыхтаваных кадраў, значыць, сістэма, якая існуе, не спрацоўвае.

Нельга згортваць праграму жыллёвага будаўніцтва на сяле. Прывабіць спецыяліста на вёску можна толькі жыллём.

А працу ў сельскай гаспадарцы варта аднесці да ліку найбольш паважаных, удзячных. Калі мы не ўсюды можам плаціць сельскаму чалавеку вялікія грошы, то давайце не саромецца гаварыць яму «дзякуй» за яго самаадданасць, за працу днём і ноччу. Мы шкадуем ордэны і медалі нават тым, хто іх заслугоўвае.

Не можам і не хочам друкаваць пустыя грошы, то давайце адальём дастаткова медалёў, яны не будуць «пустымі», і гэта стане вельмі адчувальнай падтрымкай для ўмацавання любога працоўнага калектыву.

Нейкім чынам мы забыліся пра маральныя стымулы, а цана ім паранейшаму высокая. Зрабіць прафесію аграрыя паважанай — вось што патрэбна.

У Амерыцы фермер — вельмі паважаны чалавек. Нашы фермеры працуюць не менш. Давайце шукаць стымулы.

У нашай гаспадарцы за 35 гадоў ніхто не атрымаў дзяржаўных узнагарод, і гэта пры нашых пастаянна высокіх паказчыках. Мы знойдзем, каго вылучыць на ўзнагароды — і даярку, і свінарку, і даглядчыка, і трактарыста... Усё гэта — цуд што за людзі! І з якім прыўзнятым настроем ардэнаносец будзе хадзіць на працу! Простыя ісціны, вельмі простыя, але забытыя.

Варта запаліць у прэстыжных сельскагаспадарчых ВНУ «зялёнае святло» для медалістаў — выпускнікоў вясковых школ, — прымаць іх без экзаменаў і без конкурсу, асабліва хлопцаў.

Плаціць студэнту за кошт гаспадаркі (а магчыма, і не толькі гаспадаркі) павышаную стыпендыю. Сказаць яму: «Ты потым гарантавана застаешся ў нас». Затрымаць у краіне ўсіх выдатнікаў сельскагаспадарчых ВНУ.

А пакуль нават выдатнікі — выпускнікі вясковых школ з'язджаюць у суседнюю Польшчу і Прыбалтыку, там можна паступіць без экзаменаў.

Павінна больш эфектыўна працаваць і сістэма падтрымкі сельгасвытворцаў за здадзеную прадукцыю.

**Мы зараз пачалі шмат гаварыць пра нацыянальную ідэю. Самая галоўная нацыянальная ідэя, на мой погляд, — у адзінстве. Занадта многа разнастайных выклікаў навокал.**

Спачатку давайце разам утрымаем на належным узроўні сваю сельскую гаспадарку, гарантуем уласную харчовую бяспеку. А потым пойдзем далей.

**Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

***Ад рэдакцыі.* Творчая брыгада шчыра дзякуе старшыні прафкама акцыянернага таварыства Валянціну Супрыновічу за дапамогу ў падрыхтоўцы публікацыі.**







**Гэтыя дыпломы — таксама «трафеі» выставы ў Маскве «Прадэкспа-2017» — за найлепшы смак.**

УНП 200193456